# КАФЕДРА АГУЛЬНАГА ПРАГРАМІРАВАННЯ



*Паседжанне кафедры праводзіць яе загадчык, дацэнт Г. А. Драбушэвіч (у цэнтры). У дзелавой абстаноўцы абмяркоўваецца парадак правядзення вопытнай эксплуатацыйнай падсістэмы «Сесія» АСК—ВНУ. Фота Д. Прэса.*

КАФЕДРЫ агульнага праграміравання тры гады. Але можна без перабольшання сказаць, што выкладчыкі і студэнты універсітэта знаёмы з ёй не менш, чым з іншымі кафедрамі. Прычына такой папулярнасці — ствараемая ва універсітэце аўтаматызаваная сістэма кіравання. Першыя дзве падсістэмы вучэбнага комплексу «Сесія» і «Стыпендыя» ўкаранёны на ўсіх факультэтах універсітэта. Экзаменацыйныя ведамасці друкуе машына, яна ж і апрацоўвае вынікі сесіі, дае рэкамендацыі стыпендыяльным камісіям, рыхтуе загад і неабходныя бухгалтарскія дакументы для выплаты стыпендыі. Але галоўнае тое, што першыя падсістэмы АСК БДУ дапамаглі змяніць погляды дэканатаў, кіраўнікоў падраздзяленняў універсітэта на ролю ЭВМ у вучэбным працэсе. Урэшце дэканаты і аддзел кадраў могуць даведацца аб дакладнай колькасці студэнтаў на факультэтах, курсах і ў групах. АСК БДУ запатрабуе ад іх строгага вызначэння груп, забароніць пераходы з групы ў групу на працягу семестра, упарадкуе сістэму перздач экзаменаў (на розных факультэтах яна праходзіць па-рознаму), дазволіць перайсці толькі на машыннае (без стыпендыяльных камісій) размеркаванне стыпендый і інтэрната, але для гэтага трэба выпрацаваць і адзіныя крытэрыі (яны ж таксама розныя на факультэтах), вызначыць сапраўдную, а не справаздачную паспяховасць.

Наступным этапам будзе стварэнне падсістэм вучэбнага комплексу АСК БДУ: бягучая паспяховасць і наведваемасць; улік, справаздачнасць і рух студэнтаў; кадры студэнтаў; аналіз якасці грамадскай работы. Усе гэтыя падсістэмы, а таксама «Сесія», «Стыпендыя» і «Абітурыент» будуць распрацаваны на аснове ЕС ЭВМ і адзінага інфармацыйнага банка даных.

Хочацца напомніць, што толькі поўнае ўзаемадзеянне тых, хто распрацоўвае сістэмы, і спажыўцоў дазволіць значна палепшыць арганізацыю вучэбнай работы і якасць падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй. Наспела вострая неабходнасць раздзяліць распрацоўку АСК БДУ і яе эксплуатацыю. У ВЦ БДУ неабходна тэрмінова стварыць аддзел або групу эксплуатацыі, укамплектаваўшы яе вопытнымі спецыялістамі і тэхнічнымі работнікамі. Работы па стварэнню АСК БДУ з'яўляюцца асновай навукова-даследчай работы кафедры. Дастаткова сказаць, што па гэтай тэматыцы апублікавана ў 1975 годзе 26 навуковых работ. На кафедры распрацаваны шэраг метадаў апрацоўкі вялікіх масіваў інфармацыі, укаранён на многіх прадпрыемствах і ў ВЦ генератар кабольных праграм, распрацавана падсістэма «Зарплата сумяшчальнікаў» і г. д.

У цеснай сувязі з навуковай работай праводзіцца і гаспадарчадагаворная работа. Яна вядзецца ў супрацоўніцтве з цэнтральным навукова-даследчым і праектна-тэхнічным інстытутам арганізацыі і тэхнікі кіравання, галоўны напрамак якога — аўтаматызацыя кіравання вытворчасцю. З кожным годам расце аб'ём работы. Калі ў 1973 годзе было выканана работ на 75 тысяч рублёў, у 1974—на 205 тысяч рублёў, то ў 1975 годзе—на 300 тысяч рублёў— самы вялікі дагавор ва універсітэце. Распрацаваны і ўкаранёны задачы АСК на 28 прадпрыемствах. Эканамічны эфект ад укаранёных задач склаў 774 тысячы рублёў. Вялікую дапамогу ў выкананні заданняў дагавору аказваюць студэнты, асабліва V курса. У бягучым навучальным годзе 28 студэнтаў V курса праходзілі на кафедры вытворчую практыку. Амаль усе яны былі залічаны на штатныя пасады матэматыка-праграміста. Студэнты прынялі сацыялістычныя абавязацельствы па дастойнай сустрэчы XXV з'езда КПСС і паспяхова іх выканалі.

У цяперашні час кафедра рыхтуе зборнік навуковых работ. Выкладчыкі кафедры праводзяць даследаванні і ў сугуба матэматычных раздзелах навукі. Так, на кафедры падрыхтавана і абаронена У. П. Саўчуком дысертацыя па механіцы, М. А. Вараб'ёў і Ч. Н. Роліч рыхтуюць дысертацыі па дыферэнцыяльных ураўненнях.

Вучэбная работа кафедры складаецца з двух асноўных раздзелаў: агульнаадукацыйнага — курс «ЭВМ і праграміраванне», практыкум па ЭВМ і вучэбная практыка першых і другіх курсаў; спецыяльнага — спецыялізацыя па матэматычнаму забеспячэнню АСК. Тут сустракаюцца вялікія цяжкасці. Зусім яшчэ нядаўна мы вывучалі праграміраванне для ЭВМ «Урал-1», затым для «Мінск-22», «Мінск-22М», «Мінск-32», а цяпер для ЕС ЭВМ. Кожныя 3—4 гады мы пераходзім да новай ЭВМ, а гэта патрабуе вывучэння, перш за ўсё, праграміравання для яе самімі выкладчыкамі, распрацоўкі методыкі выкладання, новых вучэбных дапаможнікаў, задачнікаў, заданняў для лабараторных работ і г. д. У гэтым навучальным годзе мы поўнасцю перайшлі на праграміраванне для ЕС ЭВМ, адны з першых ва універсітэтах краіны. Падрыхтаваны і выдадзены даведнік праграміста для ЕС ЭВМ, у бліжэйшы час выйдзе з друку вучэбны дапаможнік «Праграміраванне на ФОРТРАНе». Рыхтуецца вучэбны дапаможнік па курсу «ЭВМ і праграміраванне» (першае выданне «Вылічальныя машыны і асновы праграміравання» выйшла ў 1973 годзе), па практыкуму на ЭВМ, па спецлабараторыях, па мовах праграміравання КОБОЛ, ПЛ/1, РПГ. Вялікая ўвага ўдзяляецца навукова-даследчай рабоце.

## ВЫНІКІ ПРАЦЫ — З'ЕЗДУ ПАРТЫІ

Прывяду толькі некалькі лічбаў—112 дакладаў было зроблена на студэнцкай навуковай канферэнцыі ў 1975 годзе і 36 работ было прадстаўлена на рэспубліканскі агляд (з іх 17 атрымалі першую катэгорыю).

І яшчэ, спецыялізаваць студэнтаў мы пачынаем не з першага курса, а з 9-га класа. Пры кафедры пачала функцыяніраваць школа юнага праграміста, у якую залічана 300 вучняў 9—10-х класаў. Многія з іх збіраюцца паступаць на ФПМ.

Усе гэтыя поспехі кафедры былі б немагчымы без дакладнага плана работы і, у першую чаргу, плана палітыка-выхаваўчай работы. Выкладчыкі і студэнты, як і ўвесь савецкі народ, уключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва па дастойнай сустрэчы XXV з'езда партыі, узялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы і з гонарам іх выконваюць. Дастаткова сказаць, што ў 9-й групе III курса, які спецыялізуецца на кафедры, 10 студэнтаў здалі сесію на «выдатна», 12 — на «добра» і «выдатна», 3 маюць пасрэдныя адзнакі і толькі адна студэнтка мае дрэнную адзнаку. Такой паспяховасцю не можа пахваліцца ні адна з груп фізічнага ці матэматычнага факультэтаў.

У праекце ЦК КПСС да XXV з'езда партыі перад праграмістамі пастаўлены канкрэтныя задачы: забяспечыць далейшае развіццё і павышэнне эфектыўнасці аўтаматызаваных сістэм кіравання і вылічальных цэнтраў, паслядоўна аб'ядноўваючы іх у агульнадзяржаўную сістэму збору і апрацоўкі інфармацыі. На рашэнні гэтых важных задач і сканцэнтраваны зараз намаганні ўсіх работнікаў нашай кафедры.

**Г. ДРАБУШЭВІЧ,**
**загадчык кафедры агульнага праграміравання.**

## ВУЧЫЦЦА ТВОРЧА МЫСЛІЦЬ

Павышэнне якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў — гэта асноўная задача, на рашэнне якой накіраваны ўсе намаганні выкладчыкаў ВНУ. З гэтай мэтай выкарыстоўваюцца розныя формы работы са студэнтамі. Адной з самых эфектыўных форм з'яўляецца развіццё навукова-даследчай работы студэнтаў. Самастойна праводзімыя даследаванні, пошук арыгінальных метадаў, выбар найбольш аптымальных алгарытмаў — усё гэта садзейнічае развіццю студэнта як асобы, якая ўмее мысліць, творча падыходзіць да рашэння пастаўленых задач, знаходзіць эфектыўныя метады для іх рашэння.

На кафедры агульнага праграміравання факультэта прыкладной матэматыкі працэс уцягнення студэнтаў у навукова-даследчую работу пачынаецца ўжо з першага курса. Для студэнтаў арганізаван гурток «Праграміст», у якім яны робяць свае першыя крокі ў навукова-даследчай рабоце.

Рыхтуючыся да выступлення на занятках гуртка, студэнт атрымлівае навыкі работы з літаратурай, вучыцца выбраць галоўнае з патоку інфармацыі, дакладна выкласці адабраны матэрыял, канкрэтызуючы асноўныя палажэнні тэмы. Расшырэнне і паглыбленне гэтага працэсу адбываецца на другім курсе, дзе таксама працуюць два гурткі па двух напрамках — сучаснае праграміраванне і аўтаматычная апрацоўка даных. Вынікам НДР студэнтаў першага і другога курсаў з'явілася прадстаўленне 56 дакладаў на XXXII студэнцкую канферэнцыю. Тэматыка выступленняў была вельмі разнастайнай і ахоплівала такія галіны, як мультыпраграміраванне, сістэмы з раздзяленнем часу, арганізацыі памяці і даных, метады доступу к даным, кампілятары, інтэрпрэтатары і г. д.

Удзел у рабоце гуртка з'яўляецца першай прыступкай, наступны этап — работа ў СНДЛ і СВЦ адпаведна на III і IV курсах. Тут студэнты ўжо самастойна працуюць над атрыманымі заданнямі. Галіной іх даследавання з'яўляюцца пытанні праграмнага забеспячэння АСК і ЭВМ. Сярод гэтых работ можна выдзеліць тыя, што датычаць пытанняў аўтаматызацыі праграміравання задач АСК, распрацоўкі метадаў унутранай сарціроўкі з выкарыстаннем вектараў запісаў, пабудовы масіваў з выкарыстаннем функцыі расстаноўкі, мовы ФОРТРАН-ФПМ і інтэрпрэтатара з яе і г. д. Акрамя гэтага, студэнты самастойна рашаюць эканамічныя задачы, якія ўваходзяць у склад АСКВ прадпрыемстваў Беларусі і за яе межамі.

Рашэнне гэтых задач патрабуе ад студэнтаў умення разабрацца ў эканамічнай сутнасці задач, інфармацыйна ўвязваць з другімі задачамі і падсістэмамі АСКВ, распрацоўваць алгарытм рашэння, аптымальны з пункту гледжання выкарыстоўваемага часу рашэння і аб'ёму выкарыстоўваемай памяці і знешніх канструкцый, колькасці прамежкавых масіваў, колькасці сарціровак. Студэнты паспяхова спраўляюцца не толькі з рэалізацыяй алгарытма, але і здаюць распрацаваныя задачы ў даследчую і прамысловую эксплуатацыю на ІВЦ прадпрыемстваў. Імі выконваліся работы для Петрадварэцкага гадзіннікавага завода, для Адэскага завода Кастрычніцкай рэвалюцыі, для прадпрыемстваў Гродна, Віцебска, Гомеля, Бабруйска, Пінска, Баранавіч.

З лепшымі работамі студэнты выступаюць на навуковых універсітэцкіх канферэнцыях (у 1975 годзе было зроблена 55 дакладаў), міжвузаўскіх канферэнцыях, іх работы прадстаўляюцца на рэспубліканскі агляд студэнцкіх навуковых работ. У 1974 годзе кафедрай былі прадстаўлены 22 работы, з іх 5 аднесены да першай катэгорыі. Работа студэнткі V курса Т. Высоцкай «Рашэнне задачы АСК. Разлік кошту ў оптавых цэнах» аднесена да першай катэгорыі і ўдастоена першай прэміі на рэспубліканскім конкурсе навуковых работ студэнтаў па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках 1974—1975 навучальнага года. У 1975 годзе было прадстаўлена 36 работ, з іх да першай катэгорыі аднесены 17 работ, 3 работы былі рэкамендаваны на ўсесаюзны агляд. Гэта работы Л. З. Утко, С. М. Шапаравай і А. В. Сняжко, Г. К. Даўжанковай.

**С. БАНДАРЭНКА,**
**старшы выкладчык.**

## НАША НАСЦЕННАЯ

«Суматар» — так завецца насценная газета нашай кафедры.

Для чалавека, звязанага з вылічальнай тэхнікай, гэта паняцце асацыіруецца з пэўным абсталяваннем у электронна-вылічальнай машыне. Але не абавязкова быць праграмістам, каб зразумець, які сэнс уклалі супрацоўнікі і студэнты кафедры ў назву сваёй газеты. Сумiраваць, накопліваць інфармацыю аб жыцці кафедры, аналізаваць яе і расказваць аб ёй чытачам — вось у чым мы бачым задачу газеты.

«Суматар» асвятляе камсамольскую работу, грамадскую дзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў кафедры, работу навуковых гурткоў, ход вучэбнага працэсу. Гэтыя матэрыялы дапамагаюць студэнтам вызначыць свае інтарэсы пры выбары спецыялізацыі.

З мэтай прыцягнення студэнтаў у навуковыя гурткі ў газеце змяшчаліся заметкі кіраўнікоў гурткоў, у якіх расказвалася пра задачы кожнага гуртка, пра план яго работы.

З цікавасцю прачыталі выкладчыкі і студэнты артыкул аб рабоце студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі. Асвятлялася работа студэнтаў кафедры ў час трэцяга працоўнага семестра ў студэнцкіх будаўнічых атрадах.

Пастаяннай рубрыкай стала «Школа юнага праграміста». Школа створана па ініцыятыве выкладчыкаў кафедры, і ўся работа, звязаная з гэтым пачынам, адлюстравана ў нашай газеце.

Радасна, што «Суматар» заваяваў сімпатыі чытачоў. Газету з цікавасцю чытаюць выкладчыкі і студэнты ўсіх кафедр факультэта. Зараз рэдкалегія рыхтуе спецыяльны нумар, прысвечаны XXV з'езду КПСС.

**Н. ПЕРАВЕРЗЕВА,**
**рэдактар насценгазеты «Суматар».**

**Нямала клопатаў у членаў педагагічнага савета школы юнага праграміста, якая паспяхова дзейнічае пры кафедры агульнага праграміравання.**

**НА ЗДЫМКУ:** на чарговым пасяджэнні педсавета абмяркоўваецца праграма заняткаў у школе юнага праграміста.

Фота Д. Прэса.



# ЛІТАРАТУРЫ НАРОДАЎ СССР— НЕАСЛАБНУЮ ЎВАГУ

ЧАЦВЁРТЫ год пры Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР дзейнічае дарадчы орган на грамадскіх асновах — Навукова - метадычны савет па вышэйшай філалагічнай адукацыі. Ён займаецца пытаннямі методыкі выкладання філалагічных дысцыплін у вышэйшай школе краіны, распрацоўвае прынцыпы ўкладання розных вучэбных праграм, разглядае і прадстаўляе гэтыя праграмы для зацвярджэння ў якасці тыпавых і г. д. Савет складаецца з шасці секцый: рускай мовы і літаратуры, роднай мовы і літаратуры, славянскіх моў і літаратур, рамана - германскіх моў і літаратур, усходніх моў і літаратур і класічнай філалогіі. У дзве секцыі ўваходзяць і прадстаўнікі нашага універсітэта: прафесар А. Я. Супрун і дацэнт Б. У. Норман з'яўляюцца членамі секцыі славянскіх моў і літаратур. прафесары М. Р. Ларчанка і Л. М. Шакун — старшынёй і намеснікам старшыні секцыі роднай мовы і літаратуры, аўтар гэтых радкоў — вучоным сакратаром гэтай секцыі.

На сваім апошнім пасяджэнні, што адбылося ў канцы студзеня ў Ленінградзе, секцыя роднай мовы і літаратуры разглядзела стан і задачы выкладання курса «Літаратура народаў СССР» на філалагічных факультэтах універсітэтаў. Было адзначана, што гэты курс мае вялікае ідэйна-палітычнае значэнне ў справе камуністычнага, інтэрнацыянальнага выхавання і адукацыі студэнцкай моладзі. Разам з тым ён значна расшырае культурны кругагляд студэнтаў, паглыбляе іх веды краіназнаўчага характару. Падкрэсліўшы ўсё гэта, секцыя выказалася за больш уважлівыя адносіны да гэтага курса, за павышэнне яго ролі ў сістэме універсітэцкай адукацыі і выхавання.

Асаблівая ўвага была звернута на стварэнне новай вучэбнай праграмы па літаратуры народаў СССР. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў прафесар Кішынёўскага універсітэта Б. А. Трубяцкой, з садакладамі — прафесар А. А. Шарыф (Масква) і дацэнт Т. Я. Грынфельд (Ленінград). Усебакова абмеркаваўшы даклад і садаклады, секцыя прыйшла да агульнай думкі адносна асноўных прынцыпаў укладання такой праграмы. Галоўныя з іх — наступныя.

Новая праграма павінна ахопліваць па магчымасці ўсе літаратуры народаў СССР (а іх сёння — 76). Што ж датычыцца выкладання гэтага прадмета, то лічыць мэтазгодным выбарачны характар падачы матэрыялу — па рэгіянальнаму прынцыпу. У кожным канкрэтным выпадку павінны вывучацца літаратуры не менш двух-трох рэгіёнаў. У рэгіён аб'ядноўваюцца літаратуры народаў, найбольш блізкіх па сваім геаграфічным становішчы, умовах гістарычнага развіцця, культуры, мове (напрыклад: літаратуры усходніх славян, Прыбалтыкі, Каўказа і Закаўказзя, Паволжа, Крайняй Поўначы і г. д.). У праграме знойдзе адлюстраванне развіццё літаратур народаў СССР як у савецкі час, так і ў дакастрычніцкі перыяд. Прычым савецкая літаратура павінна прадстаць як пераемніца лепшых дэмакратычных традыцый дарэвалюцыйнай эстэтычнай спадчыны.

У праграме, якая павінна арганічна паяднаць гісторыка - літаратурны прынцып выкладання матэрыялу з тыпалагічным, шырока адлюструецца актыўнае ўзаемадзеянне і ўзаемаўплыў літаратуры народаў СССР, у першую чаргу рускай і іншых народаў — з літаратурай роднай (факты генетычных і кантактных сувязей, узаемапераклад, тыпалагічныя сходжанні). Праграма будзе арыентаваць выкладчыкаў і студэнтаў на паглыбленае разуменне асноўных заканамернасцей літаратурных сувязей.

Праект новай праграмы даручана скласці кафедры рускай савецкай літаратуры Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. Ламаносава. Да чэрвеня праект павінен быць гатовы. Яго абмеркаванне мяркуецца правесці на пасяджэнні секцыі, якое плануецца яшчэ да заканчэння гэтага навучальнага года.

Зыходзячы з асаблівай важнасці курса «Літаратура народаў СССР» у справе навучання і камуністычнага выхавання студэнцкай моладзі, секцыя вырашыла хадайнічаць перад Мінстэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР аб узнаўленні ў МДУ імя М. Ламаносава самастойнай кафедры літаратуры народаў СССР. Гэта кафедра павінна стаць галоўнай у пытаннях распрацоўкі методыкі выкладання літаратуры народаў СССР у ВНУ краіны, падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў, каардынацыі навукова-даследчай працы асобных кафедр літаратуры народаў СССР, якія маюцца ў рэспубліканскіх універсітэтах (на Украіне, у Грузіі, Арменіі). Разам з тым секцыя просіць міністэрства даць дазвол на арганізацыю аналагічных кафедраў у вядучых рэспубліканскіх універсітэтах, дзе яны пакуль што не існуюць як самастойныя навуковыя адзінкі (у прыватнасці ў нашым універсітэце).

Секцыя звярнула ўвагу на вострую неабходнасць стварэння вучэбных дапаможнікаў па літаратуры народаў СССР, у аснову якіх павінен быць пакладзены рэгіянальны прынцып адбору і абагульнення фактычнага матэрыялу. Секцыя таксама звярнулася ў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР з просьбай вырашыць пытанне складання і выпуску серыі хрэстаматый па курсу літаратуры народаў СССР, якія б адпавядалі новай вучэбнай праграме.

Думаецца, усе гэтыя рашэнні будуць садзейнічаць далейшаму ўдасканаленню вучэбнага працэсу, у тым ліку і ў нашым універсітэце.

**В. РАГОЙША,**
**дацэнт кафедры беларускай літаратуры.**

ГУМАРЫСТЫЧНЫ ПЕРАПЫНАК

## *МЯСЦОВАЯ ХРОНІКА*

### КАЛЯ СПОРТУ

*Новы рэкорд устанавіў студэнт журфака У. Зайцаў. Ён абабегаў шэсць вучэбных карпусоў і атрымаў пяць залікаў усяго за 10 хвілін 8 цэлых і 6 сотых секунды. Гэты вынік на 32 секунды вышэй, чым у былога студэнта П. Волкава, прычым апошні атрымаў на два залікі менш.*

### ДАЙШОЎ ДА РУЧКІ

*Аспірант гістфака Д. Іваноў, скрупулёзна вывучаючы тэўтонскі меч XII стагоддзя, дайшоў да ручкі.*

### У СВЕЦЕ ПРЫГОЖАГА

*Студэнт юрфака Б. Ігολкін пасля трох год упартай працы знайшоў свой творчы почырк у разьбе па дрэву. Выстаўка яго работ адкрыта ў аўдыторыі юрыдычнага корпуса (другі паверх).*

## КАЛІ Б СЕСІЮ ЗДАВАЛІ...

### АСТАП БЭНДЭР

Астап зазірнуў у білет, закінуў нагу на нагу і весела паглядзеў у сумленныя вочы экзаменатара.

— Адзін мой знаёмы, што характэрна, таксама некалі здаваў экзамены... Цяпер у Акадэміі навук працуе... Дворнікам...

— Вельмі цікава,— экзаменатар ветліва кашлянуў у хустачку. —Ну, а што вы можаце сказать па першаму пытанню?

— Мабыць, тое ж, што сказаў некалі сябар майго далёкага дзяцінства Коля Остэн-Бакен сяброўцы майго ж дзяцінства польскай прыгажуні Інзе Зайонц у момант іх знаёмства: «Які пасаж!»

— Пераходзьце да другога пытання.

«Лёд крануўся!» — падумаў вялікі камбінатар, з пяшчотай паглядзеўшы на экзаменатара.— «Камандаваць парадам буду я!»

### ШЦІРЛІЦ

Інфармацыя да роздуму: па-першае, выдатніца Каця сядзіць на тры сталы наперадзе. Так што нічым дапамагчы не зможа. Па-другое, сусед па сталу Шэленберг даўно ўжо пад «каўпаком» у экзаменатара Мюлера, які, напэўна, нешта ведае пра шпаргалкі ў левай кішэні Шэленберга. Па-трэцяе, да выкліку да стала экзаменатара засталося ўсяго толькі семнаццаць імгненняў зімы...

### ЯЎГЕН САЗОНАЎ

— Як людазнаўца і душалюб я разумею вашу замінку, прафесар. Нават мне, эсенізатару, цяжка падабраць адзнаку, здольную як след ацаніць адказ аўтара рамана веку, а дух веку патрабуе творчага падыходу не толькі ...але і да адзнакі ведаў студэнтаў. Вы, канешне, на перадавых рубяжах... і ўсведамляеце, што тая абставіна, калі з трох пытанняў я ўдастоіў адказам толькі адно, тлумачыцца выключна маёй агульнавядомай сціпласцю. Іменна сціпласць штурхае мяне згадзіцца з простай выдатнай адзнакай. Канешне, «цудоўна» або «надзвычайна» лепш перадаюць сутнасць справы. Але— так ужо і быць — я згодны і на «выдатна»

## ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ



Індыйскія рыбакі.



Вечназялёны поўдзень Індыі.

Фота У. Будая.

ГУМАРЫСТЫЧНЫ ПЕРАПЫНАК

З ПІСЬМАЎ ПРАКТЫКАНТАЎ

## ВУНДЭРКІНДЫ

«Дарагі сябра! гэта не дзеці, а жах.

— Дзеці, — кажу, — людзі паявіліся ад малпаў. У працэсе, так сказаць, працоўнай дзейнасці...

— Гэта па Дарвіну так!— хорам крычыць клас. — Гэтая тэорыя не даказана. Яшчэ ні адна малпа не стала чалавекам пры чалавеку.

Я нават рот раскрыў, але Мішка Сініцын, выдатнік, мяне заспакоіў:

— Вы не хвалюйцеся, Уладзімір Пятровіч! Пры сучасным прагрэсе і акселерацыі нельга ўвесь паток навуковай інфармацыі засвоіць. Я вам дысертацыю аднаго знаёмага навуковага супрацоўніка аб гэтым пытанні прынясу прачытаць.

Або гаварылі некалі пра індзейцаў. Вучні спыталі, чаму індзейцы размалёўваюць сябе. Стаў тлумачыць, што існуе такі звычай: калі племя збіраецца на вайну, то размалёўваецца, каб напалохаць ворага. Здаецца, добра растлумачыў. А Каця Мухіна раптам:

— Ой, дзяўчаткі! Не інакш нашы старшакласніцы паб'юцца — дзяўчаты з 10-га «А» ўвесь перапынак ля люстра алоўкамі вочы фарбавалі!

А чаму вада мокрая? А чаму кола круглае? А чаму?.. Не даюць урок весці. Усё ты ім растлумач, па пальцах раскладзі. З аднаго боку — гэта добра, што дзеці дапытлівыя, але ж яны заўсёды з сучаснымі абставінамі шукаюць аналогіі. На мінулым тыдні расказваў я пра старажытную Грэцыю, пра міфалогію. Пытаюць:

— А Арфей «Александрыну» Мулявіна лепей за «Песняроў» выконваў?

— Васіліса Прыгожая прываблівей за Анастасію Вярцінскую?

Гэта не дзеці, а суцэльны кашмар! Каб ты ведаў, што вырабляюць мае вундэркінды на перапынку! Учора, напрыклад, Іванчыкава з трэцяга паверха хацелі скінуць, каб пераканацца ў тым, што паскарэнне свабоднага падзення раўняецца 9,8 м/сек. у квадраце. На тратуары, унізе, Сініцын з будзільнікам час засякаў. Добра, што своечасова спынілі.

Галава ад іх пытанняў круціцца. Хочацца сесці і заплакаць. Садзішся, бярэш кнігі і пачынаеш штудзіраваць.

Учора Каця Мухіна спытала:

— Уладзімір Пятровіч, чаму людзі не лятаюць?

Вось сяджу і вучу законы аэрадынамікі».

А. ХІМАНІЧ.

### СА СШЫТКАЎ

«Мітрафанушка жыў добра таму, што яму не трэба было займацца».

«На ложку ляжала вялікае новае пярына».

«Тры багатыры былі апрануты ў ваеннае абмундзіраванне».

«Аднойчы раніцаю я ішоў і раптам убачыў, што надвор'е цудоўнае. Ішоў дождж, свяціла сонца і быў мароз».

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз.
Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 01062 Заказ № 221.

Рэдактар
А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.